да вышэйшых духоўных каштоўнасцей, таму што душа ніколі не ўбачыць прыгажосці, калі яна сама не стане прыгожай.

Прагрэс без чалавечнасці, мудрасці, любві да высокіх духоўна-маральных каштоўнасцей — нішто, ён патрабуе маральнага абнаўлення, таму што ў ім разбураецца чалавек. Чалавецтва павінна зазірнуць, нарэшце, у бездань чалавечых страсцей — нянавісці і любові, помслівасці і здольнасці дараваць. У працах па псіхіятрыі шмат пішуць аб помсце і яе ўплыве на чалавека, але аб дараванні — амаль ніколі. А яно заслугоўвае сур'ёзнай увагі. Дакладней, узаемасувязь паміж дараваннем і пакаяннем. Гэтую праблему трэба старанна даследаваць, пакаянне — дараванне павінна стаць практыкай узаемаадносін на ўсіх узроўнях. Калі ігнараваць ролю маральнага і духоўнага фактараў у прыродзе чалавека, чалавецтва будзе рухацца да хаосу, да бездані эканамічных і палітычных крызісаў. Але калі мы здзейснім гэты радыкальны духоўны пераварот, катастрофу можна параадолець, а значыць, чалавецтва пераадолее дробязнасць нацыяналізму на ўсіх узроўнях і зробіць крок насустрач сусветнай чалавечай супольнасці. Чалавецтва, якое здзейсніла вялікія дасягненні ў навуцы і тэхніцы, цяпер павінна ўзрасці маральна і духоўна, каб ступіць у XXI ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**С.Л.Вілейка,**
*дацэнт*

## ФАРМІРАВАННЕ БЕЛАРУСКАЙ ІДЭІ — АДНА З ВАЖНЕЙШЫХ МЭТ КУЛЬТУРНАЙ ПАЛІТЫКІ

Разам з фарміраваннем усебакова развітой асобы, якая вылучаецца ў якасці стратэгічнай задачы культурнай палітыкі, на першы план выходзіць задача фарміравання беларускай ідэі.

Сёння назіраецца рост нацыянальнай свядомасці народа, аб чым сведчаць шматлікія праяўленні занепакоенасці аб недахопе ўвагі да адраджэння і развіцця беларускай культуры і мовы. Гучаць заклікі аб праяўленнях нацыянальных гордасці і годнасці. Актывізавалася ў гэтым напрамку дзейнасць творчых саюзаў.

Як вядома, высокія нацыянальныя пачуцці і ідэі могуць трансфармавацца ў практычныя дзеянні, стаць матэрыяльнай сілай. Многія вядуць размову аб Беларусі, аб адраджэнні яе культуры. Але пры відавочнай агульнасці дэклараваных мэт

назіраецца адрозненне ў шляхах і метадах практычнай рэалізацыі палітычных праграм. Пытанні беларусізацыі выходзяць на авансцэну грамадскага жыцця і ўлічваюцца пры ажыццяўленні культурнай палітыкі. Жыццё не перабудаваць без цудоўнага вобраза будучай Беларусі, таму сацыяльнае значэнне набывае ідэя беларусізацыі. Наш нацыянальны ідэал павінен прадугледжваць адраджэнне беларускасці — забеспячэнне адзінства ўсіх класаў і слаёў грамадства на карысць Айчыны. Гэта ідэя зможа выканаць сваю арганізацыйную і стымулюючую ролю ў грамадстве, калі будзе аб'ядноўваць у якасці кампанентаў нацыянальна-культурныя каштоўнасці. Так ці інакш нацыя не можа ўдасканальвацца без сацыяльна-прававых нормаў, па якіх трэба зверыць практычныя дзеянні. Сёння выпрацоўка дастойных стымулюючых арыенціраў становіцца надзейнай і аб'ектыўнай неабходнасцю. Айчынная культура валодае высокай духоўнай нарматывісцкай мэтай, яе трэба павярнуць да паўсядзённага духоўнага жыцця, узбагаціць і прывесці ў адпаведнасць з сучаснай дзейнасцю. Адзін са шляхоў рашэння гэтай задачы — удасканаленне культурнай палітыкі і яе паслядоўнае ажыццяўленне.

Неабходна падкрэсліць: заклік да нацыянальнай кансалідацыі не азначае, што трэба кінуцца ў другую крайнасць, якая называецца этнацэнтрызмам, нацыянальнай замкнёнасцю і абмежаванасцю.

Асаблівае значэнне нацыянальнае адраджэнне набывае для воінаў Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. У першую чаргу важнае значэнне мае развіццё такіх яго кампанентаў, як Радзіма, Айчына, патрыятызм. Як паказалі вынікі сацыялагічнага даследавання, якое праведзена ва Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь у 1996—1997 гг., такое паняцце, як Айчына, займае толькі адзінаццатае месца ў сістэме цэннасных арыентацый ваеннаслужачых тэрміновай службы. Тут ёсць над чым задумацца: Айчына, яе абарона заўсёды былі святымі паняццямі, асабліва для тых, хто са зброяй у руках заклікаЕны забяспечыць бяспеку краіны.

Таму адной з мэт культурнай палітыкі з'яўляецца забеспячэнне ўсімі даступнымі шляхамі і сродкамі духоўнага, маральна-псіхалагічнага, ратнага энтузіязму, такога патрэбнага зараз нашай Радзіме для яе станаўлення і развіцця.

Важная роля ў дасягненні дадзенай мэты належыць шэфству работнікаў культуры і мастацтва над асабовым складам Узброеных Сіл. Такое шэфства зарадзілася яшчэ ў гады станаўлення Савецкай Арміі і на працягу дзесяцігоддзяў служыла

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўмацаванню яе абараназдольнасці, павышэнню баявой моцы. Мы павінны не страціць гэтую добрую традыцыю, наадварот, усімі сіламі падтрымліваць яе і ўмацоўваць.

Сёння прыходзіцца канстатаваць, што становішча спраў у галіне ваенна-шэфскай культурнай работы патрабуе сур'éзнага ўдасканалення. Сітуацыя такая, што актыўную работу праводзіць у асноўным толькі рэспубліканская ваенна-шэфская камісія, якая ўзначальваецца народным артыстам СССР кампазітарам І.М.Лучанком. У раёнах дыслакацыі воінскіх часцей часта адсутнічаюць цесныя сувязі паміж імі і мясцовымі ўстановамі культуры, творчымі аб'яднаннямі. Сталічныя дзеячы культуры і мастацтва не асабліва імкнуцца ў аддаленыя ад цэнтра гарнізоны.

Неабходна весці культурна-шэфскую работу сістэматычна, планамерна, комплексна і не зводзіць яе толькі да эпізадычных мерапрыемстваў у святочныя і юбілейныя дні. Мэтазгодным у сувязі з гэтым з'яўляецца замацаванне за воінскімі часцямі грамадзянскіх устаноў культуры, творчых калектываў, у асобных выпадках, дзе гэта магчыма, і творчых работнікаў. Акрамя таго, неабходна палепшыць якасць ваенна-шэфскай работы, павысіць ролю культуры і мастацтва ў выхаванні ў воінаў высокіх маральных якасцей, пастаяннай гатоўнасці да абароны Айчыны.

Менавіта ваенна-шэфскія камісіі творчых саюзаў павінны выступаць ініцыятарамі стварэння і прапаганды новых высокамастацкіх твораў літаратуры і мастацтва на гераічна-патрыятычную тэматыку, якія ярка і праўдзіва адлюстроўваюць баявыя і працоўныя традыцыі беларускага народа і яго Узброеных Сіл.

Даўно воіны чакаюць ад дзеячаў мастацтва стварэння запамінальных вобразаў абаронцаў Радзімы, якія б імкнуліся наследаваць сённяшнія салдаты, сяржанты, афіцэры. На жаль, за гады існавання беларускай арміі не з'явіліся творы, якія б сталі падзеяй айчыннага мастацтва. Да гэтага часу ў нас няма салдацкіх страявых песень на беларускай мове, а нашы баявыя сцягі працягваем выносіць пад даўно напісаныя рускія ваенныя маршы.